Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

10 МАЯ 2022 г. АЎТОРАК № 89 (29711)

«МЫ — МІРНЫЯ ЛЮДЗІ, АЛЕ НАВАТ НЕ СПРАБУЙЦЕ З НАМІ РАЗМАЎЛЯЦЬ З ПАЗІЦЫІ СІЛЫ»

Выступленне Прэзідэнта Беларусі на цырымоніі ўскладання вянкоў з нагоды 77-й гадавіны Вялікай Перамогі

Фота БелТА.

Паважаныя ветэраны!

Дарагія суайчыннікі і госці Беларусі!

Чыста па-чалавечы хачу ў пачатку звярнуцца да вас і падзякаваць усім, хто прыйшоў на гэтую святую плошчу. Яны там павінны бачыць і ведаць, што мы не забыліся, што Беларусь памятае. І пакуль мы прыходзім сюды разам са сваімі дзецьмі — гэта сведчыць, што Беларусь будзе памятаць заўсёды.

Віншую вас з Днём Вялікай Перамогі. Перамогі, якая захавала беларускую нацыю і абумовіла шлях развіцця ўсіх пакаленняў беларусаў, стала неад'емнай часткай агульнай нацыянальнай ідэі.

І сёння каля свяшчэннага Вечнага агню мы схіляемся перад нашымі ветэранамі, аддаём даніну памяці тым, хто загінуў, абараняючы наша права жыць. Жыць свабодна на роднай зямлі і ў сваёй дзяржаве.

Мы памятаем усіх, хто да апошняга патрона стрымліваў ворага на граніцы і каля Брэсцкай крэпасці, пад Мінскам і Магілёвам, хто быў закатаваны ў засценках гестапа, хто згарэў у Хатыні, Дальве і Трасцянцы. Усіх, чыёй крывёю насычана кожная пядзя нашай беларускай зямлі.

Гора і смерць прынеслі свету гітлераўскія каты. Нас, беларусаў, рускіх, украінцаў, яны хацелі сцерці з твару зямлі, а заадно з намі яўрэяў, цыганоў, татараў і, на іх думку, іншых «недачалавекаў».

Мільёны жыхароў паклала на алтар Перамогі нашая вялікая агульная Радзіма — Савецкі Саюз.

І восемдзясят мінулых гадоў не заглушылі гэты боль.

Гонар і слава пераможцам!

Вечная слава загінулым!

Мінута маўчання.

(Мінута маўчання.)

Дарагія сябры!

Мы, беларусы, брацкія нам народы, памятаем і разумеем значэнне сённяшняга дня Вялікай Перамогі не толькі ў сваім жыцці, але і ў лёсе свету. Мы шануем гэтую старонку гісторыі, захоўваем у сэрцы боль аб стратах і гонар за нашых слаўных пераможцаў.

Мы проста не маем права і не можам на гэта забыцца. Таму, звяртаючыся да сучасных пакаленняў, я найперш адрасую сваё пасланне тым, хто жыве ў тумане хлусні і падману, хто пазбаўлены магчымасці вывучаць праўдзівую гісторыю Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны ў школах. Тым, на чыіх вуліцах усё гучней чуваць лозунгі ветэранаў СС і неафашыстаў, якія там маршыруюць. Я адрасую гэтае пасланне ад імя беларускага народа тым, хто Дзень Перамогі аб'явіў па-за законам, хто разбурае помнікі загінулым вызваліцелям і перш за ўсё савецкаму салдату.

Ведаючы і разумеючы месца Беларусі і сваё месца ў сістэме каардынат цяперашняй планеты, я, тым не менш, як прадстаўнік народа-пераможцы звяртаюся да народаў краін Захаду. Падкрэсліваю: мой сённяшні зварот да вас, людзей гэтых самых, як і мы, краін Захаду. Вашыя палітыкі зрабілі вельмі шмат, каб вы забыліся, каму свет абавязаны вызваленнем ад фашызму.

Сёння нямногія з людзей, якія жывуць за межамі Беларусі і Расіі, ведаюць, што Другую сусветную вайну выйграў савецкі салдат, Савецкі Саюз. Што другі фронт, пра які сёння шмат кажуць на Захадзе, адкрылі толькі летам 44 года мінулага стагоддзя, тады, калі перамога СССР стала відавочнай. Якім бы дзіўным гэта ні здавалася, але ў пераможным наступленні Чырвонай Арміі, якое прывяло да разгрому фашысцкай Германіі, цяперашнія ўладары свету тады ўбачылі пагрозу. Таму адразу быў узяты курс на ачарненне і дэманізацыю Савецкага Саюза і славянскага свету.

Хоць пасля пераможнага мая Савецкі Саюз, ЗША і іншыя пераможцы разам, аднагалосна вынеслі прысуд нацызму ў Нюрнбергу падчас трыбунала над ваеннымі злачынцамі. І ўсе былі ўпэўненыя, што бесчалавечная ідэалогія расавай перавагі раздушана і што яе чорны цень ніколі больш не ўзнікне над нашай планетай.

Але што відаць сёння? Сярэднявечная барацьба за тэрыторыі і рэсурсы працягваецца. Толькі на змену крыжовым паходам прыйшла экспансія замежных фондаў. Тую ж агрэсію назіраем цяпер пад лозунгамі захавання правоў чалавека і нейкага ўстойлівага развіцця краін. Але насамрэч палітыкі Захаду не жадаюць прызнаваць тое, што мільярды людзей на Зямлі стагоддзямі жывуць па сваіх законах. А каб стварыць свет па свайму вобразу і падабенству, яны спрабуюць аслабіць тых, хто жыве і думае інакш.

Звяртаючыся сёння да народаў Захаду, хачу сказаць: ну вы ж не настолькі сляпыя, каб не разумець усе жахлівыя наступствы спроб сілавога пераўладкавання Лівіі, Ірака, Сірыі, Афганістана і іншых краін. Гэта ўсё было на нашай памяці. Пераўладкавалі? Дэмакратыя пад крылом натаўскіх самалётаў пакінула народам гэтых краін толькі боль і пакуты, ахвяры і разбурэнні, эканамічны хаос і ўсякую адсутнасць перспектыў. І ніякі марыянетачны ўрад, які вы прывялі там да ўлады, не здольны зрабіць квітнеючы аазіс. Я хачу, каб вы, народы Захаду, простыя людзі ў Парыжы і Берліне, Варшаве і Нью-Ёрку, Бруселі і Амстэрдаме, якія жывуць марамі аб зялёнай Сахары, планамі выратавання лясоў Амазоніі і накормленых дзецях Афрыкі, ведалі, што вашыя грошы, вельмі шмат вашых грошай траціцца на самы звычайны генацыд. Ніякую Сахару вы не ратуеце, ніякія лясы вы не ратуеце і дзяцей вы не накармілі. Вас выкарыстоўвалі ўцёмную — у Югаславіі, Лівіі, Іраку, Афганістане, а цяпер нашай Украіне.

Паслядоўнікі нацыстаў апантаныя ідэяй рэваншу. Але адкрыта ваяваць са спадкаемцамі савецкага народа не гатовыя. Добра засвоілі ўрокі, відаць, таму напампоўваюць Украіну зброяй, ваююць з мемарыяламі, сімваламі, ветэранамі, вязнямі канцлагераў і нават іх сем'ямі.

У самым страшным сне немагчыма было ўявіць, што там, у гэтай брацкай нам краіне, якая цудам выжыла пад ботам фашысцкіх акупантаў, нацызм зноў падніме галаву. І гэта вашыя заходнія эліты выгадавалі гэтага монстра, зрынулі законную ўладу, узброілі да зубоў наваспечаных паслугачоў Бандэры і Шухевіча, зрабілі нацызм дзяржаўнай ідэалогіяй, сутыкнулі братоў-украінцаў і расіян.

Шалёныя палітыкі Еўропы перш за ўсё не разумеюць, што, выкарыстоўваючы сёння фашызм, нацызм ва Украіне, яны заўтра будуць змагацца супраць яго, таму што ён не можа быць замкнуты межамі адной краіны. Ён заўтра захлісне ўсю Еўропу. Хацелася б, каб і ўкраінцы, якія паддаліся гэтаму, разумелі, што сёння яны героі, з іх робяць герояў, а заўтра іх будуць знішчаць, таму што нацызм Еўропе не патрэбен. У тых заходніх краінах жадаюць, каб нацызм быў у нас, каб мы раздзіраліся ў супярэчнасцях, каб мы пакутавалі.

СТАР. 2

ISSN 1990 — 763X

«МЫ — МІРНЫЯ ЛЮДЗІ, АЛЕ НАВАТ НЕ СПРАБУЙЦЕ З НАМІ РАЗМАЎЛЯЦЬ З ПАЗІЦЫІ СІЛЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Я думаю, Захаду трэба над гэтым пасылам падумаць, а Украіне трэба падумаць над тым, каб не прыйшлося звяртацца да нас, каб выратаваць цэласнасць і адзінства ўкраінскай дзяржавы. Там ужо падзялілі Украіну на часткі. Там ужо думаюць, які кавалак адарваць сабе. І вы іх ведаеце.

На шматпакутнай зямлі сёння грымяць выбухі і гінуць людзі. Так званыя нацбаты нішчаць свой народ па этнічнай прыкмеце. Але агрэсарам калектыўны Захад называе Маскву і Мінск. Таму і спрабуе выкрасліць з гісторыі нашу культуру, рускую культуру, мову і шматвяковыя традыцыі. Але ж гэта наша спадчына. І нядзіўна, што мы, беларусы, падзяляем разам з расіянамі цяжар незаконных санкцый і абмежаванняў, ад якіх вам, простым еўрапейцам і амерыканцам, будзе нанесены большы ўрон, чым нам. Вы ўжо гэта адчулі, але гэта толькі пачатак.

Там, за мяжой, нікога не хвалюе тое, што беларуская армія не ваюе. Ігнаруецца тое, што мы зрабілі для найхутчэйшага спынення баявых дзеянняў у свой час, ды і цяпер імкнёмся паводзіць сябе такім чынам.

Мы — мірныя людзі, але нават не спрабуйце з намі размаўляць з пазіцыі сілы. Вашы мары загнаць славян у новае рабства, якое вы называеце глабалізмам, нязбытныя. Але, на жаль, нічога не змянілася. Беларусь па-ранейшаму стаіць, як нязломная Брэсцкая крэпасць, на дарозе любога ворага. Усе спробы задушыць робяць нас толькі мацнейшымі і натхняюць іншых. Бо на беларусаў, расіян, якія зноў вядуць барацьбу з гэтым сусветным злом, глядзяць мільярды людзей.

Кітай, Індыя, краіны Лацінскай Амерыкі, Афрыкі, арабскія дзяржавы. Ад амерыканскай пятлі стаміліся ўсе!

Упэўнены, што і вы, простыя грамадзяне, як і большасць насельніцтва планеты, выступаеце за новы, справядлівы свет без дыскрымінацыі і санкцый, у якім усе народы свабодныя і раўнапраўныя, а пытанні і праблемы вырашаюцца шляхам дыялогу. Але вашы ўлады ніколі не скажуць вам праўду. Брытанскія, французскія, амерыканскія сродкі масавай інфармацыі працягваюць нацкоўваць сваю аўдыторыю на Расію і Беларусь. Фарміруюць у свядомасці лжывы вобраз агрэсара. Ім трэба разабрацца з нашым адзінствам, апошняй апорай нашай цывілізацыі.

Даходзіць да абсурду, калі вам забараняюць думаць, што першым чалавекам у космасе быў савецкі грамадзянін, забараняюць творы сусветна вядомых рускіх класікаў. Ці не час пачуць адзін аднаго і спыніцца? Ніхто ж з вас не хоча вайны. Але ж еўрапейскія сталіцы зрабілі ўсё, каб яна адбылася. Цяпер ужо ні для кога не сакрэт, што ўвесь заходні свет ваюе супраць Расіі ва Украіне. А нас папракаюць тым, што мы падтрымліваем Расію. Адумайцеся. Ні юрыдычнага, ні маральнага права беларусы не маюць не падтрымліваць Расію. Мы заўсёды былі разам, мы заўсёды былі адзіныя. І што б вы ні рабілі, якія стрэлы б ні кідалі ў наш бок, у вас не атрымаецца нас разарваць на кавалкі і раз'яднаць.

Не патрэбныя ніякія рэзалюцыі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, каб зразумець, што раз ты пастаўляеш камусьці зброю, прадаеш ці проста дорыш, як цяпер ва Украіне, калі ты масава туды пастаўляеш наёмнікаў, падтрымліваеш яго ў гэтай гібрыднай інфармацыйнай вайне, то ты далёка не старонні назіральнік. І не трэба пераводзіць стрэлкі на нас. Каля 50 дзяржаў згуртавалася сёння на Захадзе супраць адной Расіі. Таму нас папракаць не трэба, бо мы адны з Расіяй. Нас не 50.

Паглядзіце на сваю палітыку і падумайце, што будзе заўтра. Жадаю, каб усе мяне яшчэ раз на Захадзе пачулі. Беларусы не агрэсары, але, застаючыся саюзнікам і стратэгічным партнёрам брацкай Расіі, мы будзем яе ўсяляк падтрымліваць. Нас аб'ядноўваюць і натхняюць прыклады герояў мінулага, адказнасць перад нашымі дзецьмі і Вялікая Перамога, якую мы ніколі нікому не аддадзім. У сувязі з гэтым хачу сказаць: пакіньце нас у спакоі, не чапайце нашу святую зямлю, занадта глыбока яна насычана крывёй продкаў. І нашы магілы ў вашай зямлі не трывожце, не па-чалавечы гэта, не па-людску.

Я нешта не бачу ўсіх заходніх паслоў тут, якія прыходзілі ў Хатынь, Трасцянец, мяне прасілі, каб я іх там сустрэў, якія былі на гэтай плошчы. Дзе вы? Чаму не прыйшлі памаліцца і пакаяцца? Вось ваш твар, вось ваша нутро. Я ў Хатыні пра гэта казаў, я ведаў, што так будзе. Вы тады гулялі з намі, дагуляліся да таго, што давялі да фашызму, і сёння працягваеце сваю бязмозгую, дурную палітыку. Спыніцеся і адмоўцеся ад яе, пакуль не позна. Прызнайце ўжо нарэшце права нам самім вызначаць, як сябраваць з нашай Расіяй, з нашай Украінай. Сябраваць не супраць вас. Ад такой дружбы не будзе бяды ні Польшчы, ні Літве, ні Латвіі, ні Германіі з Францыяй. Усім будзе толькі добра ад гэтага сяброўства. Гэта датычыцца паставак сыравіны, энерганосьбітаў, транзіту тавараў, а іншых шляхоў, больш кароткіх і надзейных, няма, бо мы — суседзі, якіх не выбіраюць, якія ад Бога. Таму задумайцеся: свет, дзе паважаюць інтарэсы ўсіх і кожнага, больш надзейны за імгненныя рашэнні аб уступленні ў НАТА або будаўніцтве пасярэдзіне Еўропы агароджы праз тысячагадовы лес Белавежскай пушчы.

І дзе ж вы, абаронцы прыроды? Што ж вы заглухлі? Чаму вы не едзеце туды ратаваць жывёл, якія стагоддзямі жылі і не бачылі граніц? Дзе вы? Вы крывадушнікі і мярзотнікі. Вы баіцеся, вы баіцеся пусціць туды людзей, таму што яны ўбачаць дзясяткі, а можа, сотні магіл загінулых людзей, якія ішлі да вас па вашым клічы зусім нядаўна праз нашу граніцу. Вы іх хапалі, забівалі і закопвалі на тым месцы ў лесе. Задумайцеся! Задумайцеся і яшчэ раз падумайце: Беларусь прапануе вам стварыць такі свет разам, па-суседску, але для гэтага вы павінны перастаць як мінімум вучыць нас жыццю. Моцна паразважайце пра гэта. Падумайце аб тым, як звярнуць увагу сваіх кіраўнікоў на сапраўды важныя для будучыні планеты пытанні.

Вельмі хацеў бы, каб мае думкі былі пачутыя далёка за межамі Беларусі, там, найперш на Захадзе. Думаю, у нашага Міністэрства замежных спраў дастаткова магчымасцяў зрабіць гэта.

Вяртаючыся да сённяшняй тэмы, мне асабліва прыемна бачыць на плошчы тысячы маладых, энергічных і таленавітых беларусаў. Гледзячы ў іх ясныя, разумныя вочы, я веру, што вялікі подзвіг народа і памяць аб ім будуць жыць у стагоддзях.

Дарагія сябры!

Выбачайце за гэты, ізноў жа, нефармат. Нібыта свята, але, пагадзіцеся, вялікае, найвялікшае свята з прысмакам гора і смутку. Не хацелася б, каб гэта паўтарылася. Але ж вы павінны памятаць: гэта наша Перамога. Мы яе проста не можа нікому аддаць. Гэта наш найвялікшы здабытак, здабытак не толькі беларусаў, але ўсіх народаў Савецкага Саюза, руху Супраціўлення на Захадзе, усіх людзей, у тым ліку амерыканцаў, англічан, немцаў, якія ваявалі супраць фашызму. Давайце гэта цаніць.

Віншую вас з адным з самых галоўных нашых свят.

Жадаю героям-ветэранам здароўя і даўгалецця, а ўсім беларусам — міру, дабра і дабрабыту. Каб над намі заўсёды было такое светлае блакітнае неба і яркае святочнае сонца.

Няхай жыве і квітнее наша чыстая, светлая, цудоўная, мірная Белая Русь.

Няхай у стагоддзях захоўваецца памяць аб воінах-пераможцах.

З Днём Перамогі!

«ГАЛОЎНАЕ — ГЭТУ СІМВОЛІКУ

Цырымонія ўшанавання дзяржаўных сімвалаў

Напярэдадні Дня Перамогі наша краіна адзначыла яшчэ адно свята — Дзень Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга. Свята выпадае на другую нядзелю мая (14 мая 1995 года прайшоў рэспубліканскі рэферэндум, падчас якога пераважная большасць беларусаў прагаласавала за сённяшнюю сімволіку). Сёлета гэты дзень прыйшоўся на 8 мая.

На плошчы Дзяржаўнага сцяга ў Мінску прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя ўшанаванню дзяржсімвалаў. Асабліва кранальна і ўрачыста ўспрымалася клятва вернасці Дзяржаўнаму сцягу, якую прыносілі маладыя грамадзяне краіны.

Спецыяльна да свята на верхняй пляцоўцы плошчы Дзяржаўнага сцяга размясцілі выставу. На ёй можна было пазнаёміцца з гісторыяй стварэння гэтай плошчы і геральдыкі гарадоў Беларусі, дзяржаўных сімвалаў краіны.

Урачыстасці цырымоніі не перашкодзіў нават майскі дождж. Як і моцнай прамове Прэзідэнта, што ўзяў удзел у мерапрыемстве.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў: фармат мерапрыемства не мае на ўвазе адступлення ад афіцыёзу, але тым не менш ён дазволіць сабе сказаць некалькі неафіцыйных рэчаў. Найперш кіраўнік дзяржавы растлумачыў сваю прысутнасць на цырымоніі. «Адказ просты: мы перажылі з вамі 2020 год, мы ўбачылі розныя колеры, розныя сцягі ў гэты перыяд. З аднаго боку, дрэнна, з другога боку, добра, што мы ўбачылі гэтыя сцягі і, галоўнае, тых, хто быў за гэтымі сцягамі. Па-другое, зусім нядаўна на рэферэндуме мы прынялі новую Канстытуцыю краіны. Герб, сцяг з'яўляюцца неад'емнай часткай гэтай Канстытуцыі. Таму сёння знакавы дзень, дзень асаблівы, які дае старт новаму дыханню гэтай добрай традыцыі, народжанай у нетрах нашай новай гісторыі», — заўважыў ён.

Па словах беларускага лідара, сімвалы, якія ўвасабляюць наш суверэнітэт і нацыянальнае адзінства, народжаныя ў глыбіні народнай культуры ў эпоху глабальных узрушэнняў і ломкі сусветнага парадку. «З гэтымі сімваламі нарадзіліся і выраслі пакаленні людзей, звязаныя гістарычнай памяццю, якая і сёння, у самыя вострыя перыяды, дапамагае нам працягваць выбраны народам шлях, пераадольваючы выклікі і перашкоды», — адзначыў Прэзідэнт. Ён згадаў і 1990-я, калі беларусы адпрэчылі спробы падагнаць свой уклад жыцця пад заходнееўрапейскі стандарт, захавалі вернасць традыцыям, зберагліі нацыянальнае багацце. І зусім недалёкі 2020-ы, «калі мы не далі гісторыі паўтарыцца, абараніўшы свой выбар, свае каштоўнасці, свае сцяг і гімн».

У прамове Прэзідэнт паясніў, чаму менавіта гэтыя сімвалы маюць у Беларусі права звацца дзяржаўнымі, а не тыя, якія былі

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

ГЭТА НАС ТРЫМАЕ — ТАКІЯ ПЕРАМОГІ

Учора пасля ўскладання кветак да манумента Перамогі Прэзідэнт Беларусі адказаў на пытанні журналістаў. Аляксандр Лукашэнка пракаментаваў чуткі пра магчымую вайну з Польшчай, прапанаваў дапамогу з палівам і прадуктамі літоўцам, расказаў, як Беларусь пераадольвае санкцыі, і падзяліўся, якая частка яго работы самая патрэбная і карысная.

«Трэба было нас страпянуць»

Першае пытанне да Прэзідэнта — пра патрыятызм. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, быць патрыётам — гэта жыць у сваёй краіне, любіць і рабіць усё для яе росквіту.

«Што датычыцца гэтага дня і выхавання патрыятызму. Гэта нас трымае — такія перамогі. Ужо выраслі не адно новае пакаленне, як мінімум тры-чатыры пакаленні, але гэта сцерці не ўдаецца, дзякуючы ў тым ліку і нам з вамі», — сказаў кіраўнік краіны.

Ён прызнаўся, што для яго ўдзел у мерапрыемствах, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне, — цяжкая, напружаная работа. «Але я ганаруся, што яна ёсць, бо гэта самая патрэбная і карысная работа», — дадаў Прэзідэнт.

Ён падзякаваў усім беларусам, якія прычыніліся да святкавання 9 Мая і выказалі павагу пакаленню, што прынесла Перамогу.

«Я, стоячы там, назіраў за морам, велізарным акіянам людзей. І думаў пра тое, што тут не толькі наша слова і выхаванне. Мы такія людзі, славяне, пакуль нас не дзюбнуць, мы ходзім расслабленыя. Трэба было нас страпянуць, каб такі акіян людзей выліўся на вуліцы, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Дзякуй усім за тое, што памятаеце і прыходзіце да іх. Як мы да іх, так і нашы дзеці да нас».

«Атрымліваецца ўсё»

Чарговы раз пракаментаваў Прэзідэнт санкцыі заходніх краін у дачыненні да Беларусі. Адказваючы на пытанне, ці ўдаецца іх неяк пераадолець, ён заявіў: «Не «неяк» атрымліваецца, а атрымліваецца ўсё».

Па яго словах, так адбываецца дзякуючы таму, што краіна захавала вытворчасці тэхнікі, адзення, прадуктаў харчавання, якія сёння запатрабаваныя на рынках.

«Харчаванне: праваліўся ўвесь свет. Людзі галадаюць. Толькі непаваротлівасць, шарлатанства, халатнасць могуць прывесці да таго, што ў нас будзе дрэнна, — звярнуў увагу Прэзідэнт. — Ужо Гутэрыш (Антоніў, генсек ААН. — **«Зв.»**) заявіў: адкрывайце неадкладна Беларусь і Расію, таму што без мінеральных угнаенняў прадукцыі харчавання не будзе, людзі памруць з голаду».

«Толькі наша бязладнасць і толькі наша непаваротлівасць могуць прывесці да таго, што ў нас будзе дрэнна. Так, санкцыі — не мёд. Не толькі маральна, але і эканамічна, юрыдычна. Але мы вытрымаем. Гэта нас і гартуе, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Не пераживайце, выжывем. І не проста выжывем — нармальна выжывем».

«Хай толькі паспрабуюць»

Прэзідэнт Беларусі пракаментаваў магчымасць ваеннай агрэсіі з боку Польшчы ў дачыненні да Беларусі.

«Няхай паспрабуюць. Мы тут рогі збівалі не такім. Таму, калі яны хочуць паспрабаваць, калі ласка... Але гэта таксама мяне насцярожвае. Было 3 тысячы чалавек (вайскоўцаў. — **«Зв.»**), сёння падцягнулі ў Польшчу і Літву, халуям гэтым, 32 тысячы. Кажуць, ужо пад 40 тысяч. Мы вельмі ўважліва назіраем за сітуацыяй. Я заўсёды ваенным казаў: мы нічога не павінны празяваць. 1941-ы паўтарыць мы не павінны. Таму мы адкажам», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік краіны адзначыў, што наша армія разумее велізарныя маштабы сіл магчымага праціўніка — НАТА. «Але не трэба забываць, што ззаду Расія — ядзерная дзяржава. І ў нас адпаведны дагавор. І на гэтую тэму мы маем зносіны вельмі часта ў апошні час з Прэзідэнтам Расіі, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Да таго ж немагчыма перамагчы народ, які ваюе на сваёй зямлі, за сваю тэрыторыю, за свае сем'і і дзяцей».

Паводле яго, размовамі пра супрацьстаянне з Польшчай імкнуцца адцягнуць увагу ад вайны ва Украіне.

«І потым, напэўна, яны неяк хочуць яшчэ ад Украіны адцягнуць і нас, і Расію. Дурні поўныя, якія займаюцца піяраўшчынай, але не ведаюць, чым жыве звычайны польскі, літоўскі, нямецкі салдат. Нікому не патрэбная вайна, і перш за ўсё салдатам. А калі салдатам вайна не патрэбная, значыць, яе не будзе», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

«Літва — гэта міралюбівыя, добрыя, прыстойныя людзі»

Прадстаўніца Літвы падзякавала Прэзідэнту за тое, што беларускі бок адкрыў граніцы: «Простыя людзі едуць, мы нешта ў вас набываем. Тыя ж самыя ўгнаенні. Едуць людзі, у якіх зарплата маленькая. Вязуць паліва».

У адказ на гэта Аляксандр Лукашэнка прапанаваў літоўцам арганізавацца і выбраць пункт на граніцы, на які магчыма прывезці ўгнаенні, крупы, соль і іншае для іх. «Мы гэта зробім. Таму што Літва — гэта міралюбівыя, добрыя, прыстойныя людзі. Такія, як беларусы. А вось гэтыя ўсе вашы Ландсбергісы, Лінкявічусы і іншыя — гэта пена. Яна схлыне. Гэта вар'яты. Ну няўжо можна рабіць так, як горш уласнай краіне і свайму народу?! Ну жадаеце вы з намі ваяваць эканамічна, ваюйце. Але навошта свайму народу дрэнна рабіць?! Гэта вар'яты, якія жыцця не ведаюць. Ім добра, яны не церпяць. Паліва ў іх ёсць і газ, за якія яны не плацяць. Церпяць звычайныя людзі», — адрэагаваў Аляксандр Лукашэнка.

Ён дадаў, што беларускія санаторыі ў Латвіі і Літве ўлады гэтых краін збіраюцца канфіскаваць.

«Да чаго дайшлі: там, дзе чарнобыльцаў мы аздараўлялі — санаторыі нашы ў Латвіі і Літве — канфіскуваць сабраліся. Ну, калі дайшлі да жабрацтва да такой ступені, забірайце. Але толькі ведайце, што ў гэтага працэсу два канцы. Вы ўдарыце адным нас — атрымаеце бумерангам з іншага боку», — заявіў беларускі лідар.

Прэзідэнт падзякаваў прадстаўнікам Літвы, што яны шчыра выказваюць сваю пазіцыю.

«Мы ведаем, мы не змешваем літоўскі народ з гэтымі Ландсбергісамі. Яны жывуць самі па сабе, літоўцы самі па сабе. Літоўцы, як і беларусы, і рускія, у добрым сэнсе слова, доўга запрагаюць, а потым будуць гнаць так, што не паспее збегчы ні Вашынгтон, ні Брусель», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Марыя ДАДАЛКА.

ПРЫНЯЎ НАШ НАРОД»

сёлета прайшла на ўзроўні Прэзідэнта

вымушаны забараніць у краіне на заканадаўчым узроўні: «Першае, сімвалы — сцяг і герб — павінны адрозніваць дзяржаву ад іншых дзяржаў. Яны павінны адрозніваць нас ад іншых. Які быў прапанаваны герб? «Пагоня». Вам не нагадвае гэты герб герб іншай краіны? А мне нагадвае! Нам быў прапанаваны сцяг. Дадай яшчэ адну палоску — і мы запазычылі ў суседняй краіны сцяг. Дык няўжо ў нас не было сваёй гісторыі? Няўжо мы хацелі падагнаць сваю гісторыю, сваю краіну пад Літву ці Польшчу? І як актуальна гэта сёння гучыць! Я ўжо нядаўна казаў: сёння точаць нажы, шашкі і шаблі ў суседняй дзяржаве і мараць адхапіць паўкраіны, як гэта было да 1939 года. Можа быць, тады яны прапанавалі гэтую сімволіку пад свае мары, мары 2020-га? Але я ўжо сказаў: у 2020-м мы раз і назаўжды паставілі асінавы крыж на магіле тых, хто хоча разбурыць і знішчыць нашу краіну. Дык вось, наш герб, наш сцяг — асаблівыя, яны не падобныя на гербы і сцягі суседніх дзяржаў і іншых дзяржаў. Пагадзіцеся, гэта проста і зразумела».

Але галоўнае, адзначыў Прэзідэнт, не гэта. Сцягу і гербу павінен пакланяцца ўвесь народ. «Гэта, калі хочаце, свецкія сімвалы, гэта свецкая ікона ў краіне. Скажыце калі ласка, як мы маглі пакланяцца БЧБ-сцягам і іншым? Як, калі на гэтых сцягах кроў кожнага трэцяга беларуса! І тыя, хто гэта ведае, разумее і хто перажыў, яшчэ не памерлі. Яны жывыя. Як мы маглі пайсці на тое, каб даць права нашым людзям, заклікаць іх ушаноўваць тую сімволіку! На той сімволіцы (і сцягі ў гэтым, і колеры не вінаватыя, вы ведаеце, хто за гэта адказвае), на той сімволіцы кроў нашых людзей, на той сімволіцы плач і стогн нашых дзяцей, дзяцей Хатыні, жанчын і старых. Там крыкі людзей Мінскага гета (тут, на гэтай тэрыторыі гэта было, у Мінску). Там плач і стогн людзей, закатаваных у канцлагерах, там ганьба, здрада і калабарацыянізм. Гэта было. Яшчэ раз падкрэсліваю: ніякі сцяг і герб у гэтым не вінаватыя. Хто вінаваты, ведаем. Але мы не можам пакланяцца гэтаму», — катэгарычна заявіў кіраўнік дзяржавы.

Ён звярнуўся да прысутнай моладзі: «Я хачу, каб вы, маладыя, якія стаяць перада мной на гэтай плошчы, не забыліся пра гэта. Забудзецеся — будзе тое, што на поўдні нашай краіны, у брацкай нам Украіне. Не дай бог, каб мы яшчэ раз, менш чым праз стагоддзе, менш чым сто гадоў пасля страшнай вайны, не нашай вайны, якая пракацілася туды і назад (а колькі іх было!), каб мы ў наш час паўтарылі гэта!»

Адносна нашай дзяржаўнай сімволікі Аляксандр Лукашэнка заўважыў: «Самае галоўнае — гэтую сімволіку прыняў наш народ. І ніхто не скажа, што там нехта на кагосьці ціснуў, не было магчымасці тады ціснуць, улада зусім не такая была ў Прэзідэнта. І тады я ўнёс на рэферэндум адну і другую сімволіку — няхай народ вызначыцца. І народ вызначыўся. І гэта больш за закон. Народ вызначыўся — і ніякая кучка спадкаемцаў калабарацыяністаў і здраднікаў сёння не могуць змяніць гэтае рашэнне».

«Давайце будзем жыць мірна, давайце будзем будаваць сваю краіну, давайце будзем збірацца на мірныя добрыя мерапрыемствы ў гонар вялікага і давайце не будзем таптаць сваімі нагамі тое, што заваявалі многія пакаленні да нас. Давайце будзем ганарыцца гэтым, нашымі перамогамі і нашымі поспехамі», — заклікаў Прэзідэнт.

Паводле матэрыялаў БелТА.
Фота БелТА.

ЭСТАФЕТА ПАМЯЦІ

Зразумець, што 9 Мая — асаблівы для мінчан дзень, можна было з самай раніцы. З розных куткоў сталіцы сцякаліся ў цэнтр групкі школьнікаў, студэнтаў, прадстаўнікоў працоўных калектываў, грамадскіх арганізацый і проста нераўнадушных жыхароў сталіцы.

Фота БелТА.

Удзельнікаў святочных мерапрыемстваў можна было лёгка пазнаць на прыпынках, на платформах станцый метро і вуліцах сталіцы па сцягах, шыльдах з выявамі ўдзельнікаў вайны, «яблыневых кветках» на лацканах.

Некаторыя з іх накіроўваліся да Кастрычніцкай плошчы, дзе пачыналася ўрачыстае шэсце, ці да плошчы Перамогі, дзе яно фінішавала. Сёлета традыцыйнае ўскладанне кветак да манумента Перамогі ў Мінску трансфармавалася ў Шэсце пакаленняў. Асноўнымі героямі і ўдзельнікамі святочнай цырымоніі (зразумела, акрамя ветэранаў) стала моладзь Беларусі, тысячы хлопчыкаў і дзяўчынак — нашчадкаў пераможцаў.

Як звычайна, калона ўдзельнікаў шэсця прайшла ад Кастрычніцкай плошчы да манумента Перамогі. У першых радах — прадстаўнікі навучэнскай моладзі, ваенна-патрыятычных класаў, клубаў і вучылішчаў.

«Для мяне было вялікім гонарам удзельнічаць у гэтым шэсці. Я ўбачыла прыгажосць гэтага свята. Вялікая колькасць маладых рабят удзельнічае ў гэтым мерапрыемстве! Ніхто не застаецца абыякавым!» — дзеліцца вучаніца ваенна-патрыятычнага клуба «Сокал» Сафія Іваньковіч з Наваполацка.

Яе сяброўка Аліса Скуматава падтрымлівае: «Сённяшні дзень асаблівы. Мяне вельмі ўразіла шэсце. Адчуваецца маштаб падзеі. У мяне застанецца шмат радасных уражанняў».

Многія падлеткі прыходзілі на шэсце з партрэтамі прадзедаў, якія бралі ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне. Школьнікі дзяліліся сваімі сямейнымі гісторыямі.

Стэфанія Куранава, вучаніца 22-й гімназіі Мінска, паказала фота свайго прадзеда, які вызваляў Мінск і дайшоў да Берліна.

«Ён змагаўся за Беларусь, каб яна перамагала і быў мір. Самае галоўнае, што ў нас сёння мір. І я спадзяюся, не будзе ніколі вайны», — кажа дзяўчынка.

Кацярына Шпілявая, вучаніца 23-й гімназіі Мінска, прыйшла на плошчу з партрэтам свайго пра-

НАЙВЯЛІКШАЕ СВЯТА

БРЭСТ ПАМЯТАЕ. БРЭСТ ГАНАРЫЦЦА

Напярэдадні вечарам у Брэсцкай крэпасці сабраліся дзясяткі маладых людзей, каб далучыцца да рэспубліканскай акцыі «Запалі агонь у сваім сэрцы». У 20 гадзін вечара брастаўчане запалілі свечкі каля Вечнага агню ў памяць пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны. «Брэст памятае! Брэст ганарыцца!» — прагучала ўпэўненым хорам маладых галасоў на плошчы Цырыманіялаў мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой».

А 9 Мая сюды, у крэпасць, зранку пацяклі людскія патокі. Прадстаўнікі грамадскасці, працоўных калектываў, школьнікі са сваімі настаўнікамі сталі збірацца ў цэнтры горада загадзя, а потым рушылі арганізаванымі калонамі ў бок галоўнай святыні горада над Бугам. Да 11 гадзін, паводле ацэнкі арганізатараў, каля 50 тысяч чалавек сабралася ў крэпасці. Сем тысяч прайшло ў калоне «Беларусь памятае». Самыя яркія ўрачыстасці, як заўсёды, адбыліся на плошчы Цырыманіялаў.

— Мы заўсёды будзем помніць і шанаваць бессмяротны подзвіг нашага народа. Ніколі не забудзем трагедыю і жахі вайны, якія давялося перажыць нашаму народу падчас акупацыі: спаленыя вёскі разам з жыхарамі, замучаных у лагерах, расстраляных і закатаваных, — сказаў **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА.** — Сёння ў крэпасці, на гэтай святой зямлі, яшчэ больш востра разумееш неабходнасць захавання міру, здабытага салдатамі Перамогі.

Пасля жалобнага мітынгу ўрачыстым маршам прайшлі воіны Брэсцкага гарнізона. Да манументаў крэпасці і магіл невядомых і вядомых абаронцаў удзячныя нашчадкі ўсклалі вянкі і кветкі.

ДВАЙНОЕ СВЯТА ВЕТЭРАНА ЖАРЫКАВА

Кіраўніцтва Віцебскай вобласці, жыхары і госці горада на Дзвіне прайшлі калонай ад плошчы Леніна да плошчы Перамогі і ўсклалі кветкі да Вечнага агню каля мемарыяльнага комплексу ў гонар воінаў-вызваліцеляў, партызанаў і падпольшчыкаў.

Свята 9 Мая важнае для ўсіх, хто ведае аб адвазе і самаахвяраванні пакалення пераможцаў, адзначыў **старшыня аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН.** Чарговая гадавіна Перамогі — выдатная нагода звярнуцца да ўрокаў вайны, задумацца аб асновах незалежнасці і бяспекі дзяржавы. «На жаль, пагроз у свеце не становіцца менш, яны толькі мяняюць сваё аблічча. Абавязак сучаснікаў — не дапусціць новых разбуральных канфліктаў. Мы, беларусы, добра ведаем цану міру і захоўваем памяць аб мільёнах землякоў — ахвяр генацыду», — дадаў губернатар.

• Віцебск
Фота БелТА.

Пасля мітынгу кіраўніцтва і прадстаўнікі грамадскасці ўсклалі кветкі да бюста Пятра Машэрава.

Для ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Мікалая Жарыкава 9 Мая — двайное свята, сёлета ён у гэты дзень адзначыў 96 гадоў. З такой нагоды Мікалай Ігнацевіч зранку прымаў віншаванні і пажаданні ад кіраўніка вобласці.

А напярэдадні Віцебская вобласць далучылася да рэспубліканскай акцыі «Запалі агонь у сваім сэрцы» — часцінкі Вечнага агню ўдзельнікі акцыі запалілі ў Гарадку, Віцебску, Полацку і Браславе.

ПАМЯЦЬ НЕ МАЕ МЕЖАЎ

У Гомелі парад і ўрачыстыя мерапрыемствы з нагоды Дня Перамогі атмасферай вялікага агульнанацыянальнага свята ахапілі ўсе знакавыя гарадскія пляцоўкі. Урачыстае шэсце гамяльчан розных пакаленняў, прадстаўнікоў працоўных калектываў з партрэтамі герояў Вялікай Айчыннай вайны стала адным з самых кранальных момантаў свята. Тысячы гараджан і гасцей абласнога цэнтра жывой ракой памяці прайшлі ад плошчы Паўстання да плошчы Леніна.

• Гомель
Фота gp.by.

Мітынг-рэквіем і цырымонія ўскладання кветак і вянкоў да брацкай магілы воінаў і падпольшчыкаў адбыліся на плошчы Працы. Роўна 60 гадоў таму на гэтым месцы памяці ў Гомелі ўпершыню быў запалены Вечны агонь славы.

— У гісторыі нашай суверэннай краіны захаванне памяці аб вайне ёсць і будзе цэментавальнай патрыятычнай асновай далейшай пабудовы незалежнай дзяржавы, за свабоду і мірнае неба, якім аддадзены мільёны жыццяў воінаў і нявінных людзей, — падкрэсліў **старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО.** Па яго словах, сучаснаму пакаленню завешчаны галоўны ўрок — у бітве з самым грозным сапернікам заўсёды перамагаюць сіла духу, адзінства і любоў да Радзімы.

— Менавіта на вернасці гэтым прынцыпам стаіць духоўны фундамент беларусаў, залог працвітання будучых пакаленняў, якім трэба будзе адстойваць гістарычную праўду аб Вялікай Айчыннай вайне, захоўваць свяшчэнную памяць аб гераізме і мужнасці народа-вызваліцеля, — адзначыў губернатар.

Пасля ўрачыстага мітынгу на плошчы Працы святочны парад далі воінскія падраздзяленні, прадстаўнікі сілавых ведамстваў і кадэты. На цэнтральнай плошчы імя Леніна выставу ваеннай тэхнікі і ўзбраення, насычаную канцэртную праграму змаглі ацаніць удзельнікі святочных мерапрыемстваў — гамяльчане і госці горада.

Напярэдадні святкавання Вялікай Перамогі людзей аб'яднала асабліва кранальная рэспубліканская акцыя «Запалі агонь у сваім сэрцы». Сімвал памяці, неўміручасці і надзеі — Вечны агонь — роўна а восьмай гадзіне вечара 8 мая запалілі жыхары Гомельскага, Калінкавіцкага і Рэчыцкага раёнаў.

ПАКІНУЛІ НАДПІСЫ АБ РОДНЫХ

У Гродне многія гараджане і госці горада размясцілі імёны ветэранаў на стэндзе «Зорка Героя». Такая лакацыя на Кургане Славы была арганізавана ўпершыню. А ўрачыстасці пачаліся, як і па ўсёй краіне, з шэсця пакаленняў. Яго ўдзельнікі прайшлі з партрэтамі герояў да Кургана Славы — традыцыйнага месца святкавання Дня Перамогі.

• Брэст
Фота Віктара ДРАЧОВА.

• Гродна
Фота БелТА.

НАШЧАДКАЎ ПЕРАМОЖЦАЎ

дзеда-афіцэра і прабабулі, былой партызанкі.

«Бабуля з дзядулем пазнаёміліся на вайне. У 1944 годзе яны справілі вяселле і жылі пасля вайны вельмі шчаслива», — расказала Кацярына.

Па яе словах, памяць асабліва важная, каб не паўтарыць памылак мінулага.

Аляксандра Стэльмах з 23-й гімназіі трымала ў руках партрэт свайго прадзеда Міхаіла Радзько, які служыў кулямётчыкам і таксама дайшоў да Берліна.

«Я думаю, што не кожны сёння разумее, што гэта за свята, яго маштаб. Важнасць гэтага свята ў памяці. Пакуль мы памятаем вайну, я думаю, паўтарэння такіх падзей не будзе», — сцвярджае Аляксандра.

Захацелася пачуць ад тых, хто сёння займаецца патрыятычным выхаваннем моладзі, ці разумеюць падлеткі сэнс гэтага свята, як успрымаюць падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Сваімі назіраннямі падзялілася настаўніца рускай мовы і літаратуры 22-й гімназіі Галіна Чэпелева.

«Я папрасіла прыйсці сюды вучняў з бацькамі. І яны прыйшлі па ўласнай ініцыятыве, іх ніхто не прымушаў і не абяцаў нічога. Гэта ўнутраны парыў, які ў іх ёсць. Дзецям неабходна дапамагаць зразумець падзеі вайны. Сённяшняе пакаленне ведае пра яе толькі па апавяданнях, творах, фільмах. Але чытаюць такой літаратуры няшмат. Калі мы з вучнямі вывучаем творы пра вайну, я імкнуся закрануць струну ў душы, якая дазволіць ім адчуць боль вайны. У Год гістарычнай памяці праходзіць шмат мерапрыемстваў на тэму вайны, і дзеці імі пранікаюцца. Для мяне вызначальным быў выпадак, калі я паказвала відэа пра Хатынь і ўбачыла слёзы на вачах аднаго з шасцікласнікаў. Да сучасных дзяцей можна дастукацца, але гэты працэс павінен быць пастаянным», — расказвае настаўніца.

Упершыню ў шэсці не бралі ўдзел ветэраны, але яны прысутнічалі на пляцоўцы каля помніка. Даставілі іх на плошчу на аўтобусах, знайсці сваё месца і размясціцца ўдзельнікам вайны дапамагалі валанцёры. Безумоўна, пагутарыць з ветэранамі хацелі многія журналісты, і цярплівыя пераможцы нікому не адмаўлялі ў інтэрв'ю.

«Калі скончылася вайна, мне было 14 гадоў. Я быў зусім хлопчыкам. Мы сустракалі Перамогу крыкамі «ўра» са слязамі на вачах. Гэту дату забыць немагчыма, бо мы яе так чакалі, калі жылі на акупаванай тэрыторыі і нам прыходзілася хаваць родных, блізкіх людзей», — расказвае Аляксандр Іўс, палкоўнік у адстаўцы.

Вайсковец дадае, што для таго, каб захаваць памяць пра падзеі 1940-х, ён і яго таварышы ходзяць у школы і расказваюць пра вайну.

«Ніколі больш не трэба такіх часоў. Трэба жыць мірна. Вайна нікому лепшага не прыносіць — гэта смерці, гора і слёзы. Тыя падзеі не могуць быць забытыя. Гэтае гора заўсёды са мной», — дзеліцца Аляксандр Фёдаравіч.

Прыбыў на Плошчу Перамогі і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, які сустрэў калону разам з моладдзю. Вянок ад яго імя быў ускладзены салдатамі роты Ганаровай варты да мемарыяла першым. Разам з кіраўніком дзяржавы былі тры яго сыны.

Да помніка таксама ляглі кветкі ад прадстаўнікоў структур дзяржкіравання, Нацыянальнага сходу, судовага корпуса, сілавых структур, грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый, дыпламатычнага корпуса, ветэранаў, духавенства.

Аляксандр Лукашэнка звярнуўся да ўдзельнікаў цырымоніі з прамовай. Яна атрымалася дастаткова доўгай. Сказаць сёлета шмат яму было асабліва важна — так блізка да нашых граніц вайна не была, верагодна, з таго самага 1945 года. Так балюча і блізка да сэрцаў сучасныя беларусы не ўспрымалі ні адзін канфлікт у свеце, якіх заўсёды было досыць. Але ўсе гэтыя часы смерць і слёзы былі дзесьці там, і нас быццам бы не датычыліся...

Пасля выступлення Прэзідэнта прагучаў беларускі гімн, а пад залпы артылерыйскага салюту ў неба ўзняліся сотні паветраных шарыкаў.

Арганізатары цырымоніі дадалі ёй сёлета асабліва яркі і эмацыянальны элемент — патрыятычны флэшмоб «Хор пакаленняў» з прэм'ерай песні «Пакінуць след», якую выканалі беларускія артысты.

У завяршэнне падзеі Аляксандр Лукашэнка прывітаў ветэранаў, якія па вайсковай звычцы сустракалі кіраўніка краіны стоячы. Прэзідэнт звярнуўся да іх з пажаданнямі і загадам: «Ну што, мне зноў паўтарыць загад: жыць, жыць і доўга жыць! Без вас будзе вельмі цяжка, няпроста. Вы ж бачыце. Але вы не хвалюйцеся, мы вас не зганім. Дзякуй вам за ўсё! Мы вам абавязаныя! Жыць і толькі жыць! Больш нічога. Вы ўжо сваю справу зрабілі. Таму жывіце».

Аляксандр Лукашэнка таксама прывітаў прадстаўнікоў дыпкорпуса, якія прыйшлі на свята: «Дзякуй, што прыйшлі. Ёсць сапраўдныя паслы, якія нічога не баяцца. Ні ковіду, ні канфліктаў, ні войнаў, ні накатаў нейкіх».

Пасля таго як Прэзідэнт пакінуў плошчу Перамогі, усе жадаючыя маглі пакласці свае кветкі да помніка.

Марыя ДАДАЛКА.

ДЛЯ ЎСЁЙ БЕЛАРУСІ

На гэтым свяце заўсёды ў першых радах ішлі ветэраны, але з кожным годам іх станавілася ўсё менш, бо час няўмольны... Сёння ім ужо за 90, некаторыя набліжаюцца да 100-гадовага юбілею, як, напрыклад, Валянціна Баранава, якой сёння 99 гадоў. Яна ў ліку парадзелага ветэранскага корпуса таксама ўзяла ўдзел ва ўрачыстым мерапрыемстве. Для ганаровых гасцей былі арганізаваныя месцы каля імправізаванай сцэны. Менавіта ветэраны ў суправаджэнні сваіх родных першымі ўсклалі кветкі да Вечнага агню каля Кургана Славы.

— Памяць свяшчэнная. Мы ганарымся гераізмам, мужнасцю франтавікоў, партызанаў, падпольшчыкаў, працаўнікоў тылу, вязняў нацызму і дзяцей вайны, усімі, хто змагаўся і перамог, хто адстаяў свабоду і права на самавызначэнне. Маштаб трагедыі нашага народа велізарны. Водгукі той крывавай вайны чутныя і сёння. Адкрываюцца новыя факты генацыду беларускага народа, працягваюцца пошукі загінулых воінаў і мірнага насельніцтва. Да гэтага часу з беларускай зямлі дастаюць неразарваныя снарады, устанаўліваюцца лёсы зніклых без весткі, вяртаюцца з небыцця імёны раней невядомых герояў. Яны перадалі нам Беларусь такой, якой мы яе сёння маем і любім — моцнай, мірнай і шчаслівай. Быць удзячнымі і прымнажаць здабытак — наш святы абавязак, — падкрэсліў **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК.**

У Каложскім парку напярэдадні 9 Мая прайшла рэспубліканская акцыя «Запалі агонь у сваім сэрцы». Яе ўдзельнікі запалілі лампады каля Вечнага агню ў памяць аб загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны.

На плошчы Славы адбыўся мітынг з усладаннем вянкоў і кветак да Вечнага агню.

— Нашы бацькі і дзяды падарылі нам гэтае вялікае свята, — падкрэсліў падчас выступлення **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА.** — І наш галоўны абавязак — захаваць яго і перадаць нашым дзецям і ўнукам. На жаль, усё менш становіцца ветэранаў, але, як паказвае жыццё, мы пачынаем яшчэ больш трапятліва

• Магілёў

Фота Белта.

адносіцца да іх заваёў, разумеем, як важна захаваць праўду пра вайну. Мы жывём у квітнеючай незалежнай Беларусі і гэтым абавязаныя нашым гераічным продкам.

На плошчы Славы адбыўся маштабны канцэрт «Вечная слава Героям!», пасля якога свята перамясцілася на плошчу Адзінства, дзе адбыўся яшчэ адзін канцэрт — «Гэтых дзён не змоўкне слава».

Наогул, учора ў Магілёве святочныя мерапрыемствы праходзілі больш чым на 20 адкрытых пляцоўках.

Напярэдадні Магілёў і раённыя цэнтры вобласці далучыліся да рэспубліканскай акцыі «Запалі агонь у сваім сэрцы». На мемарыяльных комплексах у абласным цэнтры, Слаўгарадзе, Бялынічах, Чавусах адбыліся мітынгі з удзелам прадстаўнікоў улады, актывістаў БРСМ, працоўных калектываў.

НА ДВАЦЦАЦІ ПЛЯЦОЎКАХ

Сотні магіляўчан прыйшлі раніцай 9 Мая з кветкамі, паветранымі шарамі, сцяжкамі, каб прывітаць удзельнікаў парада-шэсця на вуліцы Першамайскай. Менавіта яно стала цэнтральнай падзеяй вялікага свята ў Магілёве.

Па традыцыі ўсё пачалося з урачыстага маршу воінскіх часцей Магілёўскага гарнізона, потым калона рушыла на плошчу Славы да Вечнага агню. На жаль, моцна адчувалася, як мала стала ветэранаў. Самыя стойкія з іх таксама ўзялі ўдзел у свяце. Іх урачыста правезлі на рэтра-аўтамабілях па цэнтральнай вуліцы горада.

ВАЖНА ЗНАЦЬ ГІСТАРЫЧНУЮ ПРАЎДУ

Традыцыйная лакацыя святкавання Дня Перамогі ў сталічнай вобласці — мемарыяльны комплекс «Курган Славы».

Старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН, выступаючы на мітынгу, адзначыў, што заходнія палітыкі спрабуюць прадставіць савецкіх воінаў-вызваліцеляў як агрэсараў. У той жа час у Хатыні будуецца новы музейны комплекс, які абвяргае гэта. Дадзены комплекс прысвечаны кожнаму трэцяму беларусу, які загінуў у гады вайны.

Кіраўнік Міншчыны звярнуў увагу на тое, што за мяжой зносяць помнікі савецкім салдатам. Таму сёння вельмі важна адкрываць вочы моладзі на праўду ваенных гадоў.

Аляксандр Турчын павіншаваў жыхароў рэгіёна са святам Перамогі, пажадаў шчасця, здароўя, поспехаў ва ўсіх пачынаннях. «Цаніце мір», — заклікаў старшыня аблвыканкама.

8 і 9 мая ўвечары Курган Славы заззяў колерамі дзяржаўных сімвалаў Беларусі. Такая ж падсветка была ўключана і на будынку Мінаблвыканкама.

Святлана ЯСКЕВІЧ, Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, Наталля КАПРЫЛЕНКА, Маргарыта УШКЕВІЧ, Нэлі ЗІГУЛЯ, Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ДЗЕЦІ ЛІХАЛЕЦЦА

У аграгарадку Сёмкава ўшанавалі памяць ахвяр вайны

У аграгарадку Сёмкава, што пад Мінскам, таксама ўшаноўвалі памяць герояў. Сюды завіталі запрошаныя госці — прадстаўнікі Саюза кінематаграфістаў Беларусі, ганаровы старшыня Саюза пісьменнікаў, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Мікалай Чаргінец, намеснік старшыні па арганізацыйных і творчых пытаннях Беларускага саюза мастакоў Андрэй Басалыга.

Сёмкава — адметнае для беларускай культуры месца: у царкве бралі шлюб бацькі паэта Максіма Багдановіча. Тут працавалі Якуб Колас і Янка Купала. У Сёмкаве захаваўся сядзібна-паркавы комплекс другой паловы XVII стагоддзя. Пасля рэвалюцыі 1917 года сядзібу спустошылі, а пазней там размясціўся дзіцячы інтэрнат. У гады Вялікай Айчыннай вайны дзяцей не паспелі эвакуіраваць, і немцы, якія захапілі сядзібу, зрабілі з яе канцлагер — там праводзіліся жудасныя медыцынскія эксперыменты.

Дзяцінства Мікалая Чаргінца прыпала на ваенны час. З жыхарамі аграгарадка пісьменнік падзяліўся жахлівымі ўспамінамі, аб тым, як праз акно ён бачыў людзей, павешаных нямецка-фашысцкімі захопнікамі:

— Я з болем думаю аб тым, што зрабілі з нашай Беларуссю ворагі. Неба над гэтай зямлёй — галоўны сведка тых злачынстваў, ад якіх пакутавалі дзеці. Я вельмі рады, што знайшліся людзі, якія захавалі ў гэтым месцы памяць аб нашых дзецях і гэтым краі ў стагоддзях.

Ад імя Беларускага саюза мастакоў Андрэй Басалыга засяродзіў увагу на тым, што творцы заўсёды адгукаліся на заклікі гістарычнай памяці:

— Мы возьмем удзел у стварэнні мемарыяльнага комплексу, прысвечанага жудасным падзеям, што адбыліся ў гэтым месцы. Мастакі прыкладуць усе сілы, каб памяць захавалася праз пакаленні і ніколі на нашай зямлі не было такой з'явы, як вайна.

Звяртаючыся да жыхароў Сёмкава, старшыня Саюза кінематаграфістаў Беларусі Віктар Васільеў адзначыў:

— У слове «вайна» няма ні любові, ні літасці, ні веры — нічога. Але разам з гэтым словам 81 год таму на нашу зямлю прыйшлі людзі, якія паспрабавалі знішчыць нашу нацыю праз дзяцей. Яны зрабілі ўсё, каб не было Беларусі, а разам з гэтым чысціні, дабрыні і павагі адзін да аднаго. Але салдаты, партызаны, моцныя людзі і нават дзеці стаялі, абараняючы нашу краіну. Вось гэтыя сцены палітыя крывёй нашых дзяцей. Мы павінны зрабіць усё, каб наша будучае пакаленне было такім жа чыстым, светлым, прыгожым і свабодным, як Рэспубліка Беларусь.

Арына КАРПОВІЧ, фота Лізаветы ГОЛАД.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Гомельского филиала РУП почтовой связи «Белпочта» (продавец) извещает о проведении 8 июня 2022 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС 20 %, бел. руб.
1	**Грузопассажирский фургон – PEUGEOT PARTNER** (по бух. учету, инв. № 504010069), **рег. № АЕ 7893-3**, VIN VF3GAWJYBAX516951, номер кузова Y39179000A0075071, **2010 г. в.**, цвет – синий, состояние – неудовлетворительное состояние (повышенный расход масла и неустойчивая работа ДВС, присутствие сквозной коррозии на порогах и примыкания к ним, всех дверей), пробег – 480 140 км. **Местонахождение:** г. Гомель, пр-т Речицкий, 9А	**5 110,30**	511,03
2	**Грузопассажирский фургон – UAZ 390995-360** (по бух. учету, инв. № 504000004), **рег. № АІ 6174-3**, VIN XTT390995C0456056, номер рамы 374100C0477348, **2012 г. в.**, цвет – синий, состояние – неудовлетворительное состояние (очаги коррозии кузова, рамы), пробег – 311 700 км. **Местонахождение:** г. Добруш, ул. Комарова, д. 5	**3 419,50**	341,95
3	**Легковой специальный седан – ГАЗ-31105** (по бух. учету, инв. № 504180002), **рег. № 3577 АА-3**, VIN XTH31105041234745, номер кузова 31105040024365, **2004 г. в.**, цвет – ярко-желтый металлик, состояние – неудовлетворительное состояние (неустойчивая работа ДВС, повышенный расход масла ДВС, течь сот радиатора охлаждения двигателя, рессоры изношены, имеют сильный прогиб без нагрузки, присутствие сквозной коррозии на порогах и примыкания к ним, всех дверей), пробег – 428 406 км. **Местонахождение:** г. Речица, ул. Советская, 66	**1 628,52**	162,85
4	**Грузопассажирский вагон (WAGON) – UAZ 3909** (по бух. учету, инв. № 504000020), **рег. № АА 4706-3**, VIN XTT39090260460667, номер кузова 39090060103828, **2006 г. в.**, цвет – голубой, состояние – неудовлетворительное состояние (повышенный расход масла ДВС, присутствие сквозной коррозии на задних арках, боковой двери, шум в подшипниках КПП, передачи включаются с затруднением, течь сальника полуоси заднего моста), пробег – 465 559 км. **Местонахождение:** г. Речица, ул. Советская, 66	**1 872,59**	187,26
5	**Грузопассажирский вагон (WAGON) – UAZ 390995 330** (по бух. учету, инв. № 504000025), **рег. № АІ 3713-3**, номер VIN XTT390995804203073, номер кузова 390900B0201831, **2011 г. в.**, цвет – голубой, состояние - неудовлетворительное состояние (повышенный расход масла ДВС, присутствие сквозной коррозии на задних арках, боковой двери, шум в подшипниках КПП, передачи включаются с затруднением, течь сальника полуоси заднего моста, требуется замена деталей подвески (шкворней)), пробег – 449 421 км. **Местонахождение:** г. Хойники, ул. Советская, 68	**3 393,06**	339,31
6	**Грузопассажирский фургон – УАЗ 39099 4** (по бух. учету, инв. № 504010029), **рег. № АВ 2796-3**, номер VIN XTT390994804222175, номер кузова 39090070227512, **2007 г. в.**, цвет – голубой, состояние – неудовлетворительное состояние (повышенный расход масла ДВС, подвергнут коррозии (сквозные отверстия днища и боковин), шум в подшипниках КПП, передачи включаются с затруднением, течь сальника полуоси заднего моста требуется, топливный бак подвержен коррозии, неоднократно ремонтирован при помощи холодной сварки, износ посадочных мест под шкворня в шаровых опорах, рулевых наконечников и резьбовых соединений тяг), пробег – 433 908 км. **Местонахождение:** г. Калинковичи, пл. Ленина, 3	**2 667,08**	266,71
7	**Грузопассажирский фургон – UAZ 390995** (по бух. учету, инв. № 504000023), **рег. № АІ 3106-3**, номер VIN XTT390995B0419009, номер кузова 390900B0201147, **2011 г. в.**, цвет – голубой, состояние – неудовлетворительное состояние (повышенный расход масла ДВС, подвергнут коррозии (сквозные отверстия днища и боковин), шум в подшипниках КПП, передачи включаются с затруднением, течь сальника полуоси заднего моста требуется, топливный бак подвержен коррозии, износ сателлитов дифференциала, повышенный шум во время движения, течь сальников ступицы, износ посадочных мест под шкворня в шаровых опорах, рулевых наконечников и резьбовых соединений тяг), пробег – 383 249 км. **Местонахождение:** г. Калинковичи, пл. Ленина, 3	**3 547,39**	354,74
8	**Легковой специальный седан – SAMAND LX** (по бух. учету, инв. № 504270006), **рег. № 8323 ЕН-3**, номер VIN Y3W2PSMLX9FNX0575, **2009 г. в.**, цвет – светло-серый металлик, состояние – неудовлетворительное состояние (не исправен ДВС, не достаточное давление масла, чрезмерный износ вкладышей коленчатого вала, повышенный износ посадочных мест сальников рычагов подвески, очаги сквозной коррозии днища), пробег – 192 157 км. **Местонахождение:** г. Светлогорск, ул. Ленина, д. 34	**2 787,88**	278,79
9	**Грузопассажирский вагон (WAGON) – UAZ 390995-421** (по бух. учету, инв. № 504000042), **рег. № АК 4052-3**, номер VIN XTT390995D0496969, номер кузова 374100D0418262, **2013 г. в.**, цвет – темно-зеленый, состояние – неудовлетворительное состояние (ремонт электропроводки, перебои в ДВС, увеличенный расход масла, износ поршневых колец и гильз цилиндров, повышенное содержание вредных веществ в выхлопных газах, износ ведомого и ведущего дисков, подвергнут коррозии), пробег – 264 115 км. **Местонахождение:** г. Житковичи, ул. К. Маркса, 23	**5 771,75**	577,18
10	**Легковой специальный седан (SEDAN) – GAZ-31105** (по бух. учету, инв. № 504180005), **рег. № 5448 ІІ-3**, номер VIN X9631105061332406, номер кузова 31105060112566, **2006 г. в.**, цвет – серебристый металлик, состояние – неудовлетворительное состояние (неустойчивая работа ДВС, повышенный расход масла ДВС, течь сот радиатора охлаждения двигателя, повышенный износ посадочных мест сальников рычагов подвески, повышенный износ посадочных мест подшипников, износ первичного вала (люфт), очаги сквозной коррозии днища, коррозия нижних частей дверей автомобиля), пробег – 481 262 км. **Местонахождение:** г. Жлобин, ул. Урицкого, 41	**1 527,96**	152,80

Продавец: Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: 8 (0232) 79-68-24, 8 (044) 744-12-52 – Авдейчик Евгений Григорьевич, ведущий инженер по транспорту Гомельского филиала РУП почтовой связи «Белпочта».

Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца имущества (получатель – Гомельский филиал РУП «Белпочта»):** р/с BY35 AKBB 3012 0210 2005 4310 0000 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, пр-т Дзержинского, 18, BIC AKBBBY2X, УНП 400395996, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 10 мая 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 6 июня 2022 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения.

Для участия в аукционе представляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством). **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; возместить Организатору аукциона затраты за организацию и проведение торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в течение **5 (пяти) календарных дней** с даты подписания договора. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by в разделе «ПРОДАЖА/АРЕНДА».

Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части); с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 609.

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н.С. извещает о проведении 24 мая 2022 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 50 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

ПОЛНЫЙ И ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (ЛОТЫ №№ 1–6; 8–22; 24–28; 30–35; 41–50; 51, 53) размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы»

Продавец: открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», ул. Школьная, 8, 247210, г. Жлобин, Гомельская область.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 303-53-09 – Григорович Павел Карлович. Шаг аукционных торгов –** 5 (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в российских рублях (RUB) -ПАО Сбербанк г. Москва, БИК 044525225, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО, ИНН 7707083893. К/с 30111810800000000154, БИК BLBBBY2X, ОАО «Белинвестбанк», УНП 807000028, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 10 мая 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 20 мая 2022 г. в 16.00 включительно.

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. Постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 25.01.2022 г. № 15 (29637).

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона, полный список имущества с ценами и размером задатка по лотам размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16.

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 19 мая 2022 года на 10-м открытом аукционе проводит 9-й от 5 мая 2022 года повторный открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Номер лота	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
91	VOLKSWAGEN POLO, легковой седан, кузов (рама) № XW8ZZZ61ZCG058058, 2012 г., рег. № 5292 IE-1, пробег 209 682 км	г. Брест, ул. Мицкевича, 3	18 200,00	3 640,00
92	VOLKSWAGEN POLO, легковой седан, кузов (рама) № XW8ZZZ61ZCG059726, 2012 г., рег. № 7238 ЕМ-3, пробег 204 788 км	г. Гомель, Интернациональный проезд, 13	18 000,00	3 600,00
93	VOLKSWAGEN POLO, легковой седан, кузов (рама) № XW8ZZZ61ZCG061951, 2012 г., рег. № 4253 МН-7, пробег 245 642 км	г. Минск, ул. П. Бровки, 3, корп. 2	18 000,00	3 600,00
99	Автомобиль «Камаз»-4310 ш. ХТС431000J0041278, с кузовом-фургоном К1.4320Д, № 01539, 1988 г., 4 кат., пробег 1640 км	г. Молодечно, ул. Замковая, 17, в/ч 04152	25 000,00	5 000,00
101	Автомобиль ЗИЛ-131, ш. 577034, с кузовом-фургоном К4.131, № 08295, 1984 г., 3 кат. пробег 1356 км	г. Молодечно, ул. Замковая, 17, в/ч 04152	11 500,00	2 300,00
103	Автомобиль ЗИЛ-131, ш. 346167, с кузовом-фургоном К4.131, № 070928, 1979 г., 3 кат., пробег 1191 км	г. Молодечно, ул. Замковая, 17, в/ч 04152	11 500,00	2 300,00

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, 19 мая 2022 г. в 10.00.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы **до 15.00 16 мая 2022 года.**

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться 19 мая 2022 г. с 9.15 до 10.00.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней для резидентов Республики Беларусь и 10 банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»:

белорусские рубли – р/с BY12BELB3012 0002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва, № корсчета 30101810400000 000225. Реквизиты банка: БИК 044525225 ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.

Справки по тел./факсу: **(017)319-35-41, (017) 367-58-05.**

Электронная почта: **auk@bsk.by**.

Извещение опубликовано на сайте **http://www.gki.gov.by/ru/ и https://bsk.by/.**

Без тэрміну даўнасці

ШАНОЎНЫЯ АРДЭНАНОСЦЫ

У Белдзяржмузеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адкрылася часовая экспазіцыя «За адвагу, стойкасць і мужнасць»

Выстава прысвечана найбольш масавай узнагародзе Другой сусветнай — ордэну Айчыннай вайны, 80-годдзе з дня заснавання якога будзе адзначацца 20 мая. Адвага, стойкасць і мужнасць — менавіта тое, за што ўзнагароджвалі гэтым ордэнам. За вялікія заслугі ў мабілізацыі беларускага народа на барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у перыяд Вялікай Айчыннай вайны ў 1965 годзе ордэнам Айчыннай вайны I ступені была ўзнагароджана і газета «Звязда». Гэта адзінае перыядычнае выданне Савецкага Саюза, якое атрымала баявую ўзнагароду.

— У многім яна звязана са словам «першы», — адзначае **загадчык аддзела ваенна-франтавой гісторыі Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Святлана ПРЫБЫШ.** — Гэта быў першы ордэн Вялікай Айчыннай вайны, першая ўзнагарода, у якой было раздзяленне на ступені. У выпадку гібелі ўзнагароджанага ордэн перадаваўся ў яго сям'ю. Астатнія ўзнагароды, ажно да 1977 года, вярталіся на захоўванне дзяржаве. Упершыню вельмі дакладна ў статуце было сфармулявана, за што можна было атрымаць ордэн Айчыннай вайны.

Узнагарода захоўвалася ў сям'і

Выстава ўмоўна падзелена на дзве часткі. У экспазіцыі расказваецца пра франтавікоў — прадстаўнікоў розных родаў войскаў: лётчыкаў, танкістаў, сувязістаў і іншых, узнагароджаных гэтым ордэнам. Акрамя таго, наведвальнік можа пазнаёміцца з некаторымі партызанамі і падпольшчыкамі, угнаранымі гэтай высокай узнагародай.

Адным з першых у Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны паступіў ордэн Айчыннай вайны I ступені Пятра Гучка. Беларускі лётчык загінуў незадоўга да заканчэння вайны: у красавіку 1945 года ён паў пад Берлінам. Ордэн быў перададзены ў сям'ю. Брат Пятра, Іван Гучок, у 1951 годзе здаў яго ўзнагародны комплекс у музей.

— У 1952 годзе паступіла ўзнагарода ад удавы Вікенція Скрыганава, які быў намеснікам камандзіра стралковай дывізіі, — расказвае Святлана Прыбыш. — Ён загінуў у 1945 годзе, у баях за ўтрыманне плацдарма на рацэ Одэр. У музеі захоўваюцца яго асабістыя рэчы, некаторыя з іх прадстаўлены ў часовай экспазіцыі: планшэт, сталовы камплект, хордавугламер, можна таксама ўбачыць копію ліста яго дачцэ. Яна была партызанкай і толькі ў 1943 годзе змагла звязацца са сваімі роднымі, якія знаходзіліся ў тыле. Пры выкананні баявога задання дзяўчына знікла без вестак.

На выставе прадстаўлены і поўныя кавалеры ордэна Славы, якія ў тым ліку былі ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны. У экспазіцыі можна ўбачыць кнігу «Ішоў салдат», напісаную Канстанцінам Сіманавым. У 1975 годзе быў зняты фільм з такой назвай, заснаваны на ўспамінах поўных кавалераў ордэна Славы. У кіназдымках удзельнічаў і беларус Іван Шмяя. На кнізе — надпіс ад дырэктара карціны Конанавай, адрасаваны яму.

Сярод узнагароджаных ордэнам Айчыннай вайны былі і прадстаўнікі інжынерна-сапёрных войскаў, у тым ліку сяржанты Касянчук і Ціхановіч. Пётр Касянчук літаральна за некалькі дзён, з 6 да 8 жніўня 1943 года, абясшкодзіў каля 400 мін, зрабіў дзевяць праходаў у мінных палях для танкаў і іншай тэхнікі. За гэта быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені. Міхаіл Ціхановіч таксама быў сапёрам, удзельнікам вызвалення Украіны. Наведвальнікам прадстаўлены кісет, які яму падарылі да 55-годдзя вызвалення Беларусі, і гадзіннік «Прамень», уручаны да 55-годдзя Перамогі.

Да 1985 года, з улікам юбілейных узнагароджанняў, ордэна Айчыннай вайны было ўдастоена каля дзевяці мільёнаў чалавек. Калекцыя гэтага ордэна, якая захоўваецца ў музеі, — 412 адзінак. Некаторыя з іх належалі партызанам і ўдзельнікам падпольнай антыфашысцкай барацьбы.

Многія не дачакаліся

— У адрозненне ад франтавікоў, пры ўзнагароджанні беларускіх партызанаў была свая спецыфіка, — заўважыла **вядучы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі партызанскага руху Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Марыя ГАРЭЛІКАВА.** — Нягледзячы на тое, што партызаны і падпольшчыкі здзяйснялі свае подзвігі ўжо з першых дзён вайны, заслужаныя ўзнагароды ў гады ваеннага ліхалецця атрымалі нямногія з іх. Першае масавае ўзнагароджанне адбылося толькі 1 студзеня 1944 года, калі былі адзначаны арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху.

Наступнае ўшанаванне — толькі праз чатыры гады. Многія партызаны ведалі, што прадстаўлены да ордэна Айчыннай вайны I або II ступені, звярталіся ў пэўныя інстанцыі, але ім адмаўлялі: рэкамендавалі чакаць, калі Указ аб прысваенні ордэна Айчыннай вайны будзе апублікаваны ў газетах. Некаторыя так і не атрымалі заслужаных узнагарод...

Як адзначае Марыя Гарэлікава, яшчэ больш драматычная сітуацыя была з узнагароджаннем удзельнікаў Мінскага падполля. «Яго дзейнасць была прызнана ўладамі толькі ў 1959 годзе, — удакладняе яна. — А ў 1965 годзе па ініцыятыве Пятра Машэрава выйшлі два ўказы, у выніку якіх было ўзнагароджана больш чым 20 тысяч падпольшчыкаў і партызанаў. Многія мінскія падпольшчыкі атрымалі ордэн Айчыннай вайны пасмяротна».

У экспазіцыі прадстаўлены асабістыя рэчы Яфіма Гапеева. Сярод іх — самаробная кабура, компас і сімвалічны ключ ад Ліды (да 20-годдзя Перамогі мужчына быў удастоены звання ганаровага грамадзяніна гэтага горада). Ордэн Айчыннай вайны I ступені атрымаў як адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Лідскай партызанскай зоны. Акрамя таго, што пад яго камандаваннем партызаны ажыццяўлялі шматлікія буйныя аперацыі, Яфім Гапееў яшчэ быў і стваральнікам партызанскага тэатра.

— «Наш тэатр» — так называлі гэтую трупу, — расказвае Марыя Гарэлікава. — Калі праходзілі гастролі тэатра ў Лідскай партызанскай зоне, у варожых гарнізонах прайшла чутка, што на парашутах скінуты ансамбль песні і танца з Масквы, з якім знаходзіцца адзін з кіраўнікоў партызанскага руху. За членамі трупы акупанты пачалі паляванне, але, на шчасце, схапіць кагосьці з тэатра ім не ўдалося. Тэатр падымаў у партызанаў баявы дух і ўсяляў у насельніцтва веру ў хуткую Перамогу.

Ордэнам Айчыннай вайны I ступені быў узнагароджаны і легендарны дзед Талаш, які лічыцца адным з самых пажылых удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Сярод ардэнаносцаў — і юныя ўдзельнікі партызанскай, падпольнай барацьбы. У прыватнасці, камандзір аддзялення падрыўнікоў атрада Калініна 2-й Дрысенскай брыгады Віцебскай вобласці Лёня Касач. Ён удзельнічаў у падрыве 12 эшалонаў праціўніка, а пасля вызвалення Беларусі пайшоў на фронт. Экспануецца ліст родным, у якім Лёня пісаў, што едзе помсціць ворагу за сваю родную Беларусь, і «куды б ён ні трапіў, усе дарогі вядуць на Берлін, там і канец вайне». На жаль, да Перамогі ён так і не дажыў... Ордэна Айчыннай вайны II ступені быў удастоены пасмяротна.

Высокай узнагароды — ордэна Айчыннай вайны I ступені — таксама была ўдастоена юная падпольшчыца Люся Герасіменка, якая дапамагала сваім бацькам: дзяжурыла ў дварэ, калі ў іх кватэры праходзілі сходы падпольшчыкаў, перадавала партызанам медыкаменты, расклейвала лістоўкі, выходзіла на сувязь з вязнямі Мінскага гета. Аднак на даносе здрадніка дзяўчынка была схоплена і разам з маці трапіла ў турму. У камеры яна расказвала аднаму з падпольшчыкаў, што яе моцна білі падчас допыту, але яна маўчала. Люся загінула разам са сваёй маці ў машыне-душагубцы.

Уся сям'я Хаўранковых, а гэта шэсць сясцёр, была ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны. Дзве з іх, Марыя і Надзея, — пасмяротна. Яны былі партызанкамі 35-й брыгады Магілёўскай вобласці. Марыя расклейвала лістоўкі, на гэтае заданне яна хадзіла разам са сваім маленькім сынам. Калі іх схапілі, катаванне Марыі ажыццяўлялася на вачах у малога. Аднак жанчына працягвала маўчаць і была павешана.

У гонар 40-годдзя Вялікай Перамогі ордэнам Айчыннай вайны былі ўзнагароджаны ўсе ветэраны вайны, якія на той момант былі жывыя.

Вераніка КАНЮТА.
Фота БелТА.

КІРАЎНІЦТВА І СУПРАЦОЎНІКІ МНС ЗАЛАЖЫЛІ КАЛЯ КУРГАНА СЛАВЫ АЛЕЮ ПОДЗВІГАЎ

Міністр па надзвычайных сітуацыях Вадзім СІНЯЎСКІ і ратавальнікі Беларусі залажылі Алею Подзвігаў каля Кургана Славы падчас урачыстага мерапрыемства, прымеркаванага да Дня Перамогі і Дня Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь. Алея закладзена ў гонар васьмі пажарных-ратавальнікаў — Герояў Савецкага Саюза, якія вызначыліся ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Звяртаючыся да прысутных, міністр адзначыў, што ў дні святкавання Перамогі беларусы аддаюць даніну павагі ветэранам-пераможцам, воінам, якія загінулі на палях бітваў, у тым ліку і героям-пажарным, якія разам з усім народам у самыя першыя дні вайны сталі на абарону Айчыны.

— У Год гістарычнай памяці мы праводзім вельмі важную і знакавую работу, — падкрэсліў Вадзім Сіняўскі. — Нашы спецыялісты вывучаюць архіўныя матэрыялы і ўстанаўліваюць людзей, якія ў гады Вялікай Айчыннай вайны служылі ў ваенізаванай пажарнай ахове, а затым ваявалі ў радах Чырвонай Арміі і партызанскіх атрадах на тэрыторыі нашай краіны. Намі ўстаноўлены імёны васьмі пажарных, якія ўдзельнічалі ў баявых дзеяннях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў і сталі Героямі Савецкага Саюза.

Міністр звярнуў увагу на цікавы факт, які стаў вядомы падчас такой работы: «У першыя дні вайны, 23-24 чэрвеня 1941 года, пры бамбёжках Мінска беларускія пажарныя першымі бралі актыўны ўдзел у ліквідацыі фашысцкіх запальных бомбаў, што падалі на жылыя кварталы, чыгуначныя вузлы, прамысловыя прадпрыемствы. Потым, калі пажарныя Беларусі часткова былі эвакуіраваныя на ўсход для аказання практычнай дапамогі сваім калегам, у прыватнасці ў Маскве і Ленінградзе, іх вопыт быў скарыстаны і ў гэтых гарадах пры налётах нямецкай авіяцыі».

— Вельмі важна для нас, сучаснікаў, вызначыць усіх герояў, якія сталі прыкладам для будучых пакаленняў, абнавіць і выкарыстоўваць атрыманую інфармацыю пры навучанні нашых курсантаў, ліцэістаў, усяго асабовага складу, — адзначыў міністр.

Раней ратавальнікі правялі аўтапрабег рарытэтных і сучасных пажарных аварыйна-выратавальных аўтамабіляў і матацыклаў з дзяржфлагамі і флагамі ратавальнага ведамства. Калона прайшла ад фасада пажарнай часці № 1 у Смалявічах да Кургана Славы.

Таксама падчас мерапрыемства Вадзім Сіняўскі ўручыў узнагароды і спецыяльныя званні ратавальнікам.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.

Святочнае

КВЕТКІ — ПІСЬМЕННІКАМ-ФРАНТАВІКАМ

Да Дня Перамогі на Усходніх могілках ў Мінску прыйшла дэлегацыя Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры і Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Словы ўдзячнасці ад нашчадкаў, якія ў гэты дзень прагучалі на тэрыторыі пантэона памяці з вуснаў намесніка старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксея Чароты, намесніка дырэктара Музея гісторыі беларускай літаратуры Алесі Кузняцовай, былі адрасаваны народным пісьменнікам Беларусі Івану Шамякіну, Васілю Быкаву, Івану Мележу, народнаму паэту Беларусі Аркадзю Куляшову.

Неўміручыя творы пра Вялікую Айчынную вайну — раман Івана Мележа «Мінскі напрамак», ваенныя аповесці Васіля Быкава, паэма Аркадзя Куляшова «Сцяг брыгады», раманы і аповесці Івана Шамякіна «Помста», «Зеніт», «Глыбокая плынь». Гэтыя мастацкія дакументы, прысвечаныя драматычным часінам, і сёння хвалююць чытача. Ускладаючы кветкі, і пісьменнікі Уладзімір Мазго, Таццяна Каленік, Лізавета Палеес, і вучоны сакратар музея Наталля Калядчык, іншыя ўдзельнікі паходу да месца памяці, шмат казалі пра вартасці той даўнейшай літаратуры, літаратуры мужнасці і вернага служэння гуманізму.

— Мяркую, што да магіл пісьменнікаў-франтавікоў, пахаванняў нашых папярэднікаў, якія мужна змагаліся з фашысцкай навалай, трэба прыходзіць часцей, прычым разам з моладдзю, — пракаментаваў падзею **намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксей ЧАРОТА.**

Сяргей ШЫЧКО.

Агляд часопіса:
красавіцкае «Полымя»

«КОСМАС З-ЗА АБЛОКАЎ ХМУРЫЦЬ БРОВЫ...»

Падборка вершаў Віктара Гардзея «Дзённы сад утульны і прыгожы...», якім адкрываецца красавіцкі нумар часопіса «Полымя», — з твораў зямных, прывязаных да нашых родных селішчаў. Але і тут прапісаліся такія «касмічныя» далягляды (верш «Посах мудраца»): «Космас з-за аблокаў хмурыць бровы / І не шле ў самотнікі ганца. / Лёгкі на пад'ём кій араховы / Ці дарожны посах мудраца? / Тут уніз брысці душы заблуднай / І знікаць далёка за імглой / Па адным, павольна і марудна / У бярэзніках, што пад гарой».

Зіновій Прыгодзіч знаёміць чытача з двума апавяданнямі: «Дзікая архідэя» і «Ружовы туман». Нечаканай з'яўляецца паэтычная падборка Яўгена Гарадніцкага «Класіфікацыя падарожжаў у сне». Але ж «падарожжы ў сне ажыццяўляюцца кожным на непрадказальным маршруце», таму, пэўна, іншай формы, іншых мастацкіх сімвалаў ад знакамітага літаратуразнаўцы, доктара філалагічных навук Яўгена Гарадніцкага і не трэба было чакаць.

Генадзь Аўласенка, якога ведаюць больш як дзіцячага пісьменніка, выступае з «амаль дэтэктыўнай аповесцю ў двух эпізодах» «Адплата». Вершаваная падборка Аляксандра Быкава носіць зразумелую, светлую назву — «На развітанне з зімою». І дзіўна было б, калі б вершы, сабраныя ў ёй, прыйшлі да чытача ў чэрвеньскім ці ліпеньскім нумары «Полымі». Друкуе «Полымя» і апавяданне Міледзія Кукуця «Туга па радзіме ў сыпучых пясках».

Пра творчую індывідуальнасць малавядомага заходнебеларускага паэта Улад-Ініцкага — у артыкуле Міколы Мікуліча «Каб згінула цемра, прапала няволя...». Адна з самых цікавых публікацый нумара — успаміны Міколы Мятліцкага «Літаратура і мастацтва». На дзіва асабістыя, у многім, магчыма, суб'ектыўныя, яны ўсё ж прывабліваюць сваёй шчырасцю.

Краязнаўцам краіны раю працытаць запісаны Натаплляй Казапалянскай круглы стол «Дзе мой край?» У яго рамках на пытанні часопіса адказваюць галоўны рэдактар «Краязнаўчай газеты» Максім Гальпяровіч, пісьменнік, краязнаўца Аляксандр Грудзіна, пісьменнік, супрацоўнік Маладзечанскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Максіма Багдановіча Міхась Казлоўскі, пісьменнік, краязнаўца Ігар Пракаповіч, пісьменнік, краязнаўца, загадчык літаратурнай часткі Слонімскага драматычнага тэатра Сяргей Чыгрын. Міхась Казлоўскі сярод іншага заўважыў: «Лічу знакавым той факт, што 2022-ы абвешчаны Годам гістарычнай памяці. Бо так шмат трэба зрабіць у напрамку аднаўлення гістарычнай памяці, справядлівасці, нацыянальнай самасвядомасці...»

Мікола БЕРЛЕЖ.

Падарунак да Года гістарычнай памяці

Паляна Перамогі закладзена ў Цэнтральным батанічным садзе НАН

Унікальны прыродны аб'ект садова-паркавага мастацтва ўпрыгожылі маладыя дрэвы двух відаў дуба: чарэшчатага і чырвонага, ліпы драбналістай і бука еўрапейскага.

— У нашым батанічным садзе ўжо ёсць Партызанская паляна, а сёння з'явілася яшчэ адна — Паляна Перамогі. І яна будзе з кожным годам пашырацца, — адзначыў **старшыня Прэзідыума НАН Беларусі Уладзімір ГУСАКОЎ.** — Закладка Паляны Перамогі — толькі адно з мноства мерапрыемстваў, якія арганізацыі НАН Беларусі правядзяць у Год гістарычнай памяці. Літаральна днямі ў Акадэміі навук прайшла вялікая Міжнародная маладзёжная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная Вялікай Айчыннай вайне, ідзе збор матэрыялаў у рамках Усебеларускай акцыі «Народны летапіс Вялікай Айчыннай вайны: успомнім усіх». У Акадэмію навук актыўна паступаюць матэрыялы на Рэспубліканскі конкурс работ, прысвечаны Году гістарычнай памяці па самых розных намінацыях: і вершы, і проза, і творы выяўленчага мастацтва, і розныя вырабы. У жніўні-верасні плануем падвесці вынікі, ужо створаны экспертныя камісіі.

Кіраўнік Акадэміі навук падкрэсліў: «Мы ўсе павінны берагчы і шанаваць памяць аб подзвігу герояў Вялікай Айчыннай вайны, весці актыўную працу супраць фальсіфікацыі гістарычных фактаў і агульнымі намаганнямі захаваць гістарычную праўду для будучых пакаленняў».

У Год гістарычнай памяці арганізацыі НАН Беларусі актыўна ўключыліся ў Рэспубліканскую экалагічную акцыю «Дрэва героя», якая праходзіць па ўсёй краіне. У рамках акцыі супрацоўнікі навуковых арганізацый не толькі ўдзельнічаюць у закладцы паркаў, алей, садоў, даглядаюць ужо высаджаныя дрэвы, але і дапамагаюць саджанцамі і насеннем.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Даты Падзеі Людзі

10 МАЯ

У краіне

1892 год — у Мінску адбылося ўрачыстае адкрыццё першых дзвюх ліній коннай чыгункі, якая звязала чыгуначныя вакзалы і ўскраінныя кварталы з цэнтрам. У першыя дні конка перавозіла прыкладна пятую частку дарослага насельніцтва горада. Першапачаткова дзейнічалі дзве лініі — Вакзальная, злучыла Брэсцкі і Віленскі вакзалы па вуліцах Маскоўскай і Бабруйскай, і Цэнтральная, была праведзена ад Віленскага вакзала да Саборнай плошчы. Праз тры гады была ўведзена Няміга-Захараўская лінія (ад сучаснага раёна парку імя Я. Купалы да вул. Рэспубліканскай). У 1929 годзе на змену мінскай концы прыйшоў першы трамвай.

1730 год — у Мсціславе пачалося будаўніцтва Мсціслаўскага касцёла і калегіума езуітаў — помніка архітэктуры сталага барока. Завершана будаўніцтва ў 1738 годзе.

1931 год — нарадзіўся (в. Нова-Аляксандраўка Шклоўскага раёна) Сцяпан Гаўрусёў, беларускі паэт, крытык, перакладчык. Аўтар паэм «Штодзённы лістапад», «Профіль стагоддзя», зборніка паэзіі «Паходныя вогнішчы» і іншых. Многія вершы паэта пакладзены на музыку. Пераклаў на беларускую мову шэраг твораў А. Твардоўскага, М. Ісакоўскага, Я. Райніса і іншых аўтараў. Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова.

1937 год — нарадзіўся (в. Карма Добрушскага раёна) Мікалай Арцёмавіч Калінін, беларускі кінарэжысёр. Галоўнае месца ў творчасці займала гераіка-рамантычная тэматыка. Сярод кінафільмаў: «Рудабельская рэспубліка», «Корцік», «Бронзавая птушка» і іншае. У 1965—1967 гадах у Дзяржаўным рускім драматычным тэатры Беларусі паставіў спектаклі «Мая старэйшая сястра» А. Валодзіна, «Дзеля жыцця» К. Губарэвіча і іншыя.

У свеце

1497 год — пачалося другое падарожжа Амерыга Веспучы ў Новы Свет.

1598 год — Барыс Гадуноў, які быў выбраны ў лютым Земскім саборам на царства, уязджае ў Маскву і займае расійскі трон.

1857 год — пачалося Індыйскае народнае паўстанне супраць каланіяльнага панавання Англіі (Сіпайскае паўстанне 1857 года). Жорстка задушана ў 1859 годзе.

1907 год — выступаючы з трыбуны Дзяржаўнай думы, прэм'ер-міністр Расіі П. А. Сталыпін кінуў у адрас радыкалаў словы, якія пасля сталі знакамітымі: «Вам патрэбныя вялікія ўзрушэнні, нам патрэбная вялікая Расія!».

1940 год — кароль Георг VI афіцыйна, у сувязі з надзвычайнымі абставінамі, прызначыў Чэрчыля прэм'ер-міністрам Вялікабрытаніі.

1945 год — разгромлены апошні буйны ачаг супраціўлення фашыстаў пасля іх афіцыйнай капітуляцыі — на возеры Борнхальм у Даніі.

Так гаварыў...

РЫГОР БАРАДУЛІН:

«Думаем, што жывём,
А гэта мы йдзем з гасцей.
Радуемся радзей,
А часцей бядуем.
Думаем, што гадуем дзяцей
А гэта мы
Старасць сваю гадуем».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.16	20.57	15.41
Віцебск —	5.00	20.52	15.52
Магілёў —	5.06	20.47	15.41
Гомель —	5.09	20.37	15.28
Гродна —	5.33	21.11	15.38
Брэст —	5.39	21.05	15.26

Месяц

Першая квадра 9 мая
Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Анастасіі, Івана, Мікалая, Паўла, Пятра, Сцяпана, Сямёна, Сяргея.*
К. *Антаніны, Антона, Яна.*

Фота Настассі ГРУК.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Ігнат, у цябе ёсць любімы ўрок?
— Ага!
— І які ж?
— Апошні!

Сістэма падушак у аўтамабілі выдатна прадумана — яны з'яўляюцца адразу ж, як толькі кіроўца засынае.

— Мілая, ты пойдзеш за мяне замуж?
— Так, каханы, пайду.
— Добра, я падумаю.

У жыцці трэба быць непрадказальнай і падступнай, як агурок з горкім азадкам.

Знаходлівы бацька, каб даведацца, ці мацюкаецца сын, ударыў па ягоных пальцах малатком.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы
тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1220.

Нумар падпісаны ў 19.30 9 мая 2022 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12